па-другое, прадстаўнікам апошняй катэгорыі даюць магчымасць на абарону ад крэдытораў шляхам выдачы "жалезнага ліста", які даваў ім адтэрміноўку для выплаты доўга.

У сувязі з тым, што аддадзеная пад залог зямля пераходзіла ў эксплуатацыю залогатрымальніка, прыбыткі ад яе разглядаліся як працэнты за ўзятыя пад залог грошы. Закон забараняў эксплутаваць маёнтак пасля рашэння суда аб вяртанні яго залогадавальніку, які разлічыўся з доўгам. У выпадку парушэння гэтай нормы суд павінен быў прымусіць крэдытора вярнуць атрыманыя за гэты час прыбыткі залогадавальніку. Закон патрабаваў ад залогатрымальніка захавання і наступнай перадачы закладзенай маёмасці ў тым выглядзе, у якім яна была атрымана. Карыстанне гэтай маёмасцю не павінна было прынесці ей шкоды.

У Статуце рэгламентуецца і такі новы для сярэдневяковай Беларусі від залогу нерухомасці, як іпатэка, пры якім закладзеная маёмасць заставалася ў валоданні залогадавальніка. Пры гэтым рэчавыя правы на нерухомасць замацоўваліся праз запіс у судовых кнігах. Пры такой форме залога пад запіс адной і той жа маёмасці маглі быць узяты даўгі ў некалькіх крэдытораў. Таму закон гарантаваў першынства крэдытору, які першым зрабіў запіс у кнізе земскага або гарадскога суда ў мясцовасці, дзе знаходзіцца абцяжаранная даўгамі маёмасць. Гэта быў прынцып "prior tempore, potior ire", які перакладаецца як "першы па часу, лепшы па закону". Статут усталёўваў, што "...той , хто будзе мець першы правільны законны запіс, і трымае маентак на аснове гэтага запісу.

Судовыя канцылярыі кантралявалі адпаведнасць запісаў фактычнаму стану закладзенай маёмасці. Грошы, узятыя пад запіс маёнтка або іншай нерухомасці, павінны былі адпавядаць яе кошту. Гэты прынцып называўся прынцыпам "добрай веры".

Такім чынам, залогавае заканадаўства ВКЛ канца ХУ1ст. у цэлым адпавядала буржуазным праваадносінам, якія развіваліся ў нетрах феадалізму.

*А.С. Ляднёва*
(БДЭУ, Мінск)

## ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ МІГРАЦЫЙНАЙ ПАЛІТЫЦЫ БЕЛАРУСІ

Пачатак фарміравання ўласнай міграцыйнай палітыцы звязаны з наданнем ў 1991 г. Дэкларацыі аб незалежнасці Беларусі канстытуцыйнага статуса. У савецкія часы перамяшчэнне насельніцтва было выклікана эканамічнымі і палітычнымі патрэбаваннямі

развіцця грамадства. Па статыстыцы кожны пяты беларус жыў і працаваў паза межамі Беларусі. Беларуская дыяспара у пачатку 1990-х гг. з улікамі папярэдніх эміграцыйных хваляў налічвала 3—3,5 млн чалавек, з якіх 2 млн 130 тыс. апынуліся ў новых незалежных дзяржавах. Менавіта для гэтых беларусаў надзвычай важным стала рашэнне пытанняў прававой і сацыяльнай абароны. Наспела вострая неабходнасць распрацоўкі нацыянальнай міграцыйнай палітыцы, якая б адпавядала агульнапрынятым міжнародным нормам. У Беларусі пачаў складвацца механізм па рэгуляванню міграцыйнымі працэсамі, ствараюцца адпаведныя дзяржаўныя службы. У 1992 г. рашэннем ўрада заснавана Дзяржаўная міграцыйная служба пры Дзяржкамітэце па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва (з 1997 г. — Камітэт па міграцы пры Міністэрстве працы). У складзе Савета Міністраў у 1997 г. паявілася межведамасная камісія па пытаннях міграцыі. Па яе ініцыятыве была распрацавана Дзяржаўная міграцыйная праграма рэспублікі.

У складаных сацыяльна-эканамічных умовах Беларусь фарміравала сваё міграцыйнае заканадаўства ў адпаведнасці з нормамі і прынцыпамі міжнароднага права. Важным актам заканадаўчай абароны правой беларусаў, якія стала пражывалі за межамі беларускай дзяржавы, стаў Закон аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь (1991 г., 2002 г.). З 1993 г. асобы, якія мелі доказы свайго грамадзянства былога СССР і не набылі грамадзянства іншай краіны, атрымалі права на набыцце грамадзянства Беларусі ў спрошчаным парадку. Атрыманне беларускага грамадзянства суайчыннікамі ў новых незалежных дзяржавах выраашалася на аснове двухбаковых пагадненняў. Спрошчаны парадак атрымання грамадзянства, прадугледжаны адпаведнымі пагадненнямі паміж Беларуссю і Казахстанам (1996 г.), Беларуссю і Украінай (1999 г.). Інтэграцыйныя працэсы паміж Беларуссю і Расіяй суправаджаліся прыняццем заканадаўчых актаў, якія гарантуюць роўныя правы грамадзянам гэтых краін у атрыманні адукацыі, медыцынскай дапамогі, па сацыяльнай абароне, працаўладкаванні, набыцці маёмасці і др. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. замацавала за грамадзянамі права свабоднага перамяшчэння і выбара месца жыхарства як у самой Беларусі, так і паза яе межамі, а таксама пакідаць краіну і беспераашкодна вяртацца назад. Свабодны выезд паставіў пытанне аб абароне правоў грамадзянаў Беларусі, якія даўно і пастаянна пражываюць у краінах замежжа і якія выязджаюць на заробкі. Адпаведнай прававой базай сталі міжурадавыя пагадненні па абароне правоў сваіх грамадзянаў на тэрыторыі адна адной як з сумежнымі дзяржавамі — Расіяй, Украінай, Літвой і Польшчай, так і з Кубай, Славакіяй, Казахстанам. Улічваючы наяўнасць свабоднай рабочай сілы, Беларусь заключыла двухбаковыя пагадненні аб узаемным працаўладкаванні і сацыяльнай абароне сваіх грамадзян з Літвой,

Казахстанам, Малдовай, Польшчай, Украінай. У 1995 г. было падпісана і ратыфікавана Пагадненне аб партнерстве і супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з дзяржавамі — членамі Еўрапейскага супольніцтва, якое вызначае прававое рашэнне пытанняў, звязанных з легальным працаўладкаваннем як беларускіх грамадзянаў, так і грамадзянаў краін — членаў ЕС. Дзяржаўная міграцыйная служба з 1995 г. праз выдачу ліцэнзій рэгулюе прыток замежных працаўнікоў у Беларусь і працаўладкаванне сваіх грамадзянаў за мяжой. У рэчышчы нацыянальнай міграцыйнай палітыцы распрацаваны і ўступілі ў дзеянне законы "Аб знешняй працоўнай міграцыі", "Аб іміграцыі", "Аб бежанцах".

Беларусь у вырашэнні праблем нелегальнай міграцыі дзейнічае разам з іншымі дзяржавамі. Яна член шэрагу міжнародных арганізацый па міграцыі і сацыяльнай абароне насельніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. У 1998 г. Рэспубліка Беларусь падпісала Пагадненне краін СНД аб супрацоўніцтве ў барацьбе з незаконнай міграцыяй. З верасня 1995 г. у Мінску адкрыта прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў.

***Л.Н. Мороз***
(ИГиП НАН Беларуси, Минск)

## О СИСТЕМНОСТИ И СТРУКТУРЕ ИНФОРМАЦИОННОГО ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА

В последнее время в мире существует тенденция нелегитимного формирования глобальных информационных систем, осуществляемая обычно экономически высокоразвитыми государствами. Страны с развивающимися или упадочными производственно-экономическими отношениями, институтами и сферами причисляются к пассивной среде, в которой тоже протекают интересующие мировое сообщество процессы информатизации и оборота информации.

Успехи в сфере информатизации и оборота информации во многом объясняются достаточно высоким уровнем развития в государствах национального информационного законодательства, совокупности норм которого рассматриваются часто как издательское право, программное право, компьютерное право, телекоммуникационное право и др.

В СССР при монопольном функционировании государственных средств массовой информации (СМИ), зачаточном состоянии развития радиоэлектроники и множительной техники, существовании цензуры авторских произведений не было острой необходимости в формировании специального законодательства для регулирования